ежегодно сокращается население страны. Поэтому государство должно своевременно принимать и последовательно проводить специальные меры по улучшению материального положения как населения страны в целом, так и отдельных социальных слоев общества.

## Інфармацыйныямагчымасці крыніц па гісторыі сацыяльнага партнёрства ў Беларусі

Дубовік А.А.
Беларускінацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Станаўленне сацыяльнага партнёрства ўБеларусі пакуль не стала прадметам спецыяльнага манаграфічнага даследавання ў гістарычнай навуцы. Гістарычны аспект фарміравання сістэмы сацыяльнага партнёрства пры ўсёй яго значнасці з'яўляецца адным з найменшвывучаных і адлюстраваных унавуковай літаратуры. У гэтай сувязі выклікае цікавасць аналіз інфармацыйных магчымасцяў крыніц па даследаванні гісторыі сацыяльнага партнёрства ўБеларусі.

Класіфікацыя крыніц па дадзенай праблеме дазваляе выдзеліць іх асноўныя групы:

1. Заканадаўчыя акты Расійскай імперыі, СССР і Рэспублікі Беларусь, дакументы Міжнароднай арганізацыі працы. З дарэвалюцыйнага заканадаўства трэба адзначыць закон ад 10 чэрвеня 1903 г., па якому рабочыя атрымоўвалі права на выбранне фабрычных стараст як прадстаўнікоў сваіх інтарэсаў перад адміністрацыяй прадпрыемстваў, а таксамаўказ ад 4 сакавіка 1906 г. «Аб часовых правілах аб грамадствах і саюзах», які з'явіўся заваёвай Першай рускай рэвалюцыі і, на погляд некаторых сучасных расійскіхдаследчыкаў, фактычна паклаў пачатак станаўленню інстытута сацыяльнага партнёрства ў Расіі [1; 2, с.134]. У савецкі перыяд прымаліся Кодэксы законаў аб працы, дэкрэты і пастановы органаў улады аб калектыўных дагаворах [3-4]. На сучасным этапе важнейшымі прававымі актамі,прысвечанымі развіццю сістэмы сацыяльнага партнёрства ў нашай краіне, з'яўляюцца Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь, прыняты ўпершыню ў чэрвені 1999 г., у які неаднаразова ўносіліся змяненні і дапаўненні, а ў 2019 г. прынята новая рэдакцыя кодэкса,а таксама ўказы Прэзідэнта «Аб развіцці сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь» (15 чэрвеня 1995 г.), «Аб

Нацыянальным савеце па працоўных і сацыяльных пытаннях» (5 мая 1999 г.) і інш. [5-7].

2. Апублікаваныя матэрыялы прафсаюзных органаў Беларусі. У 1920-я і пачатку 1930-х гг. друкавалісясправаздачы аб дзейнасці Савета прафсаюзаў Беларусі ў перыяд паміж прафсаюзнымі з'ездамі, дзе змяшчаліся іфактычныя дадзеныя аб калектыўна-дагаворнай рабоце ў рэспубліцы. Белсаўпрофам, а затым створанай ў 1990 г. Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) выдаваліся метадычныя матэрыялыў дапамогу прафсаюзным арганізацыям для распрацоўкі калектыўных дагавораў. У апошнія гады публікуюцца асобнымі выданнямі матэрыялы з'ездаў ФПБ (у канцы лютага 2020 г. адбыўся VIII з'езд ФПБ). У іх знаходзяць адлюстраванне і пытанні развіцця сістэмы сацыяльнага партнёрства ў краіне, месца і ролі ў ёй прафесійных саюзаў.

3. Дакументальнай крыніцай пры вывучэнні станаўлення перадумоў і фарміравання сацыяльнага партнёрства ў Беларусі з'яўляюцца тэксты калектыўных дагавораў і пагадненняў. У фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі маюцца выдадзеныя ў выглядзе брашур асобныя калектыўныя дагаворы, заключаныя ў 1920–1990-я гг. на прадпрыемствах, трэстах, вытворчых аб'яднаннях рэспублікі.Адным з самых ранніх тэкстаў, якія захаваліся у фондзе бібліятэкі, з'яўляецца «Калектыўны дагавор для шклозаводаў "Праца", "Ноўка", "Домбаль", "Прафінтэрн", "Кастрычнік", "Камінтэрн", "Ільіч", складоў у Бабруйску і Віцебску, кансервавых заводаў Белдзяржшклотрэста і яго Упраўлення», заключаны на перыяд з 1 мая 1925 г. па 1 студзеня 1926 г. (Мінск, 1925). Каштоўнай крыніцай служаць Генеральныя пагадненні паміж Урадам Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў, якія заключаліся з1990-хгг. спачатку на год, а з 1998 г. на два – тры гады.

4. Статыстычныя дадзеныя дзяржаўных і прафсаюзных органаў Беларусі. Асаблівай увагі заслугоўваюць статыстычныя справаздачы Белсаўпрофа (з 1990 г. – ФПБ), абласных саветаў і рэспубліканскіх камітэтаў галіновых прафсаюзаў аб выкананнікалектыўных дагавораў за папярэдні год і заключэнні іх на новы год (у адпаведнасці з формай № 1-КД, уведзенай ЦСУ СССР28 красавіка 1982 г.).

5. Матэрыялы перыядычнага друку, галоўным чынам, прафсаюзных выданняў «Труд», «Прафесіянальны рух Беларусі», «Труд. Профсоюзы. Общество», «Беларускі Час». Так, у часопісе «Прафесіянальны рух Беларусі», які выходзіў у 1925–1929 гг.,было надрукавана больш за20 артыкулаў і нататак, дзе на канкрэтным матэрыяле разглядаліся праблемы падрыхтоўкі і правядзення калектыўна-дагаворнай кампаніі. Важнае значэнне меў выпуск прафсаюзнай газеты «Праца», першы нумар якой убачыў свет 27 кастрычніка 1989 г. Затым, у сувязі зпрацэсамі

суверэнізацыі ў рэспубліцы, перавага была аддадзена назве «Беларускі Час». Пад гэтай назвай штотыднёвік выходзіць са студзеня 1991 г. і рэгулярнапублікуе матэрыялы аб станаўленні і развіцці сацыяльнага партнёрства ў Беларусі. З 2003 г. выдаецца часопіс «Труд. Профсоюзы. Общество», на старонках якога таксама вялікая ўвага звяртаеццца асвятленню праблемсацыяльнага партнёрства ў рэспубліцы [8].

6. Апублікаваныя працы вучоных-юрыстаў, эканамістаў, гісторыкаў,прафсаюзных работнікаў Беларусі [9-15]. У іх прыводзяцца факты аб развіцці ў рэспубліцы калектыўна-дагаворнай работы, фарміраванні адносін сацыяльнага партнёрства ў працоўнай сферы.

7. Архіўныя дакументы, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Так, у фондзе 265 (Беларускі рэспубліканскі савет прафсаюзаў) асаблівую цікавасць выклікаюцьматэрыялы аб ходзе заключэння і выканання калектыўных дагавораў на прадпрыемствах рэспублікі ў савецкі перыяд. Знойдзеныя намі архіўныя дакументы даюць магчымасць ўнесці карэктывы ў распаўсюджанае меркаванне аб першым калектыўным дагаворы, заключаным у БССР нібыта ў 1922 г. На самай справе калектыўныя дагаворы заключаліся ўжо восенню 1921 г. [16]. У фондзе 7 (Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь) НАРБ і ў Архіве ФПБ знаходзяцца пратаколы пасяджэнняў Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях і іншыя матэрыялы аб фарміраванні сістэмы сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь у 1990-я гг.

8. Вынікі сацыялагічных апытанняў, праведзеных у Рэспубліцы Беларусь па пытаннях развіцця сацыяльна-працоўнай сферы, эфектыўнасці калектыўна-дагаворнай работы [17].

У цэлым сукупнасць апублікаваных і архіўных крыніц забяспечваедастатковую базу для рашэння даследчых задачпа гісторыі сацыяльнага партнёрства ў Беларусі.

## Літаратура

1. Киселев, В.Н. Социальное партнерство в России / В.Н. Киселев, В.Г. Смольков. – М.: «Луч», 1998. – 185 с.

2. Морозов,В.Б. К истории становления социальногопартнерства в России в 1905–1917 годах / В.Б. Морозов // Известия Российского государственного педагогического университета им. А.И. Герцена. – 2007. – Том 8. – № 41. – С.119-126.

3. Томашевский, К. Л. История правового регулирования трудовых отношений в Беларуси / К. Л. Томашевский // Правоведение. –2006. –№ 1. –С. 143–158.

4. Дубовік, А. А.З гісторыі дзяржаўнага рэгулявання працоўных адносін у БССР /А. А. Дубовік // Советский этап в истории Беларуси. Сборник научных статей участников Республиканской научно-теорет. конф. Минск, 5 декабря 2019 г. – Минск: БНТУ, 2019. С. 74-81.

5. Трудовой кодекс Республики Беларусь: принят Палатой представителей 8 июня 1999г.: Одобрен Советом Республики 30 июня 1999 г., с изм. и доп. по сост. на 2 апреля 2009 г. –Минск: Нац. центр правовой информации Респ. Беларусь, 2009. – 239 с.

## Даниел Белл как теоретик постиндустриального (информационного) общества

Дубовик А.К.
Белорусский национальный технический университет

Даниел Белл родился 10 мая 1919 г. в Нью-Йорке в семье еврейских эмигрантов из западных губерний Российской империи Вениамина Белоцкого и Анны Каплан. Его первым языком был идиш. Родители работали на текстильной фабрике. Рано (когда ему было только 8 месяцев) Даниел потерял отца и имел нелегкое детство, но сумел получить хорошее образование, стать видным американским социологом, профессором Колумбийского, затем Гарвардского университетов.

Д. Белл – один из наиболее выдающихся представителей технократического направления в социологии. В 1960 г. в работе «Конец идеологии. Истощение политических идей в 50-х годах» он выступил одним из авторов (наряду с французским философом, социологом и публицистом Р. Ароном, американским социологом и экономистом У. Ростоу и др.) теории индустриального общества. Термин «индустриальное общество» был введен ранее, в начале XIX века, французским мыслителем К-А. Сен-Симоном.

Согласно Д. Беллу, технологии как инструментальные способы рационального действия являютсяглавными детерминантами общественного развития. Основным инструментом оптимизации индустриального общества, а также управления существующими в нем организациями и предприятиями выступает машинная технология. Центральными переменными, определяющими его социальную динамику, становятся труд и капитал.

Более десяти лет Д. Белл трудился над разработкой концепции постиндустриального общества. Впервые термин «постиндустриальное общество» он использовал в 1959 г. на семинаре социологов в Зальцбурге. В 1971 г. в журнале «Survey» Д. Белл выступил с обширной статьей «Постиндустриальное общество: эволюция идеи». Отмечалось, что термин «постиндустриализм» введен в оборот еще в 1914 г. индийским